№ 12
сакавік
2023 г.

*Выдаецца са студзеня 2023 г.*

# БІБЛІЯТЭЧНЫ ГАСЦІНЕЦ

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ МАГІЛЁЎСКАЙ РАЁННАЙ СЕТКІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК




**ХАТЫНЬ — деревня в Беларуси, уничтоженная вместе с жителями 22 марта 1943 года карательным отрядом (118-й батальон шуцманшафта и особый батальон СС «Дирлевангер») из мести за убийство нескольких немецких военнослужащих партизанами: в соответствии с принципом коллективного наказания 149 жителей Хатыни (в том числе 75 детей) были сожжены заживо или расстреляны за возможное оказание жителями деревни помощи этим партизанам.**
**5 июля 1969 года на месте деревни был открыт мемориальный комплекс «Хатынь», как символ и в память о массовом уничтожении нацистами и коллаборационистами мирного населения на оккупированной территории СССР.**



16 марта 2023 г. в рамках марафона к 80-летию Хатынской трагедии в Вейнянской сельской библиотеке прошёл час памяти «Трагедии сожжённых деревень». В ходе мероприятия ребята услышали историю той страшной трагедии, которая случилась 22 марта 1943 года в деревне Хатынь. Узнали названия деревень в Могилёвском районе, которые повторили судьбу Хатыни. Далее посмотрели документальный фильм «И будет жить Хатынь». И в завершение мероприятия школьники почтили минутой молчания память погибших.

*Светлана ТЕРЕШКОВА.*









В Романовичской сельской библиотеке 16 марта 2023 г. прошёл информационный час для младших школьников «Хатынь: символ вечной памяти и скорби белорусского народа». Ребята узнали об одном из самых трагических эпизодов Великой Отечественной войны на территории Беларуси — сожжении деревни Хатынь, посмотрели документальный фильм «Хатынь», ознакомились с оформленной тематической выставкой, послушали стихотворение Василия Жуковича «Бусел над Хатынью» и почтили минутой молчания жертв сожжённой деревни. Особое внимание библиотекарь уделила знакомству с мемориальным комплексом «Хатынь», который был открыт 5 июля 1969 года в память сотен белорусских деревень, уничтоженных немецко-фашистскими оккупантами и всем павшим в годы Великой Отечественной войны.

*Елизавета БОТЭ.*

### ТАК ПОМСЦІЛІ ЗА АЛІМПІЙСКАГА ЧЭМПІЁНА

21 сакавіка 1943 года на аўтадарозе Лагойск — Плешчаніцы партызаны абстралялі нямецкую калону 118 паліцэйскага ахоўнага батальёна. Адным з забітых быў гаўптман Ганс Вёльке — чэмпіён берлінскай Алімпіяды 1936 года, якога асабіста ведаў Гітлер. На наступны дзень, агледзеўшы месца партызанскай засады, немцы па слядах выйшлі да вёскі Хатынь. Сапраўды, змучаныя маразамі партызаны, нягледзячы на забарону камандавання спыняцца ў населеных пунктах, начавалі ў суседняй Хатыні. Пабачыўшы, што немцы і паліцаі акружаюць вёску, яны сышлі ў лес. Фашысты стралялі па іх, але з вялікай адлегласці не трапілі. За партызанскую акцыю вырашана было пакараць жыхароў Хатыні.

***149 ЧАЛАВЕК, З ІХ 75 — ДЗЕЦІ*** загінулі ў Хатыні. Ад вёскі засталося папялішча — карнікі спалілі ўсе 26 хат з будынкамі. Людзей загналі ў калгаснае гумно і падпалілі. Па тых, хто спрабаваў вырвацца з агню, стралялі.
Хатынь была вёска каталіцкая. Таму і імёны ў людзей былі: Петрунэля, Рэгіна, Юзэфа...

### ПЯЦЁРА ДЗЯЦЕЙ УРАТАВАЛІСЯ

Трое з іх — 13-гадовы Валодзя і 9-гадовая Соня Яскевічы, і 13-гадовы Саша Жалабковіч — здолелі схавацца ў вёсцы і не трапілі ў гумно, дзе згарэлі іх родныя. Яшчэ двое дзяцей выжыла ў ахопленым полымем гумне: 7-гадовы Віктар Жалабковіч і 12-гадовы Антось Бараноўскі. Малы Віця апынуўся пад целам маці і не згарэў, а Антось спрабаваў выскачыць з агню і быў паранены ў нагу. Карнікі палічылі яго мёртвым. Яшчэ дзве дзяўчыны, Юлія Клімовіч і Марыя Федаровіч, выпаўзлі з агню і дабраліся да лесу. Іх падабралі суседзі з вёскі Хварасцені. Але праз нядоўгі час фашысты спалілі з людзьмі і Хварасцені...

### ІОСІФ КАМІНСКІ

Адзіны дарослы хатынец, які здолеў уратавацца — Іосіф Камінскі, 56-гадовы вясковы каваль. Напярэдадні партызаны загадалі яму зарэзаць авечку і, каб яе абсмаліць, ён пайшоў у лес па галлё. Якраз тады ў Хатынь увайшлі карнікі. У агні Камінскі страціў сям'ю, яго 15-гадовы сын Адам памёр ад апёкаў і ранення. Помнік Няскоранаму Чалавеку — цэнтр хатынскага мемарыяла — гэта выява Камінскага з сынам на руках.

### КАТ ХАТЫНІ 30 ГАДОЎ ЛІЧЫЎСЯ ВЕТЭРАНАМ

Аперацыяй у Хатыні фактычна камандаваў Рыгор Васюра — начальнік штаба 118 паліцэйскага ахоўнага батальёна. Старшы лейтэнант Чырвонай арміі, ён трапіў у палон і перайшоў на нямецкую службу. (118 батальён фарміраваўся з ліку савецкіх ваеннапалонных, якія апынуліся ў Кіеўскім катле.) Хатынь — не адзіная вёска, у знішчэнні якой удзельнічаў Васюра. Пад канец вайны ён перайшоў з паліцыі ў грэнадзёрскую дывізію СС, адступіў з ёй у Францыю. Пасля вяртання ў СССР Васюра здолеў схаваць інфармацыю пра ўдзел у карных акцыях: атрымаў турэмны тэрмін за палон, але ў 1955-м быў амніставаны. 30 гадоў ён жыў у Кіеўскай вобласці, лічыўся ветэранам вайны. Яго штогод віншавалі піянеры 9 Мая, ён выступаў у школах. Можа, яму б удалося назаўсёды схаваць сапраўдную біяграфію, але ў 1985 годзе Васюра запатрабаваў ордэн Айчыннай вайны. Падчас афармлення дакументаў давялося ўзняць архівы... Усплылі і паказанні ўзводнага 118 батальёна Васіля Мялешкі, расстралянага ў 1975-м. Васюру арыштавалі і асудзілі да найвышэйшай меры пакарання.

### «КАРНІКІ»

Спаленне Хатыні стала асновай для каласальнай па мастацкай сіле аповесці Алеся Адамовіча «Карнікі» (1979). Пад зменеными імёнамі катаў лёгка пазнаюцца сапраўдныя ўдзельнікі — Васюра, Мялешка, камандзір батальёна Кёрнэр. На аснове твораў Адамовіча рэжысёр Элем Клімаў зняў фільм «Ідзі і глядзі».

### ЗВАНЫ ХАТЫНІ

Да 1964 года на месцы спаленай вёскі стаяў сціплы абеліск. Пасля там паставілі таксама досыць тыповую скульптуру «Журботная маці». Мемарыял быў адкрыты ў 1969 годзе. Яго стварылі чатыры беларускія творцы: скульптар Сяргей Селіханаў і архітэктары Юрый Градаў, Валянцін Занковіч і Леанід Левін. Паводле іх успамінаў, ідэя змясціць на слупах, што сімвалізуюць коміны спаленых хат, званы нарадзілася проста ў Хатыні, калі сярод нямой цішыні заспяваў жаўрук. На доўгія гады Хатынскі мемарыял стаў сумнай візітоўкай Беларусі.

***433 ВЁСКІ БЫЛІ ЗНІШЧАНЫЯ*** фашыстамі разам з жыхарамі ў Беларусі і адноўленыя пасля вайны. 186 так і не аднавіліся.

***36 МІЛЬЁНАЎ ЧАЛАВЕК*** наведалі мемарыяльны комплекс «Хатынь» за 54 гады.

С 13 по 21 марта в рамках марафона к 80-летию Хатынской трагедии "Реквием сожженным деревням" в Маховской сельской библиотеке состоялся проект «Нам жить и помнить». В проекте участвовали учащиеся 7 класса Маховской средней школы. Цель проекта – показать на карте масштабы злодеяний немецко-фашистских захватчиков.




В годы Великой Отечественной войны в Могилевском районе в огне было уничтожено 90 деревень. Семь деревень сожгли полностью. В них погибли 1815 человек (свыше 700 сгорели заживо). Всего в ходе карательных операций были убиты 2,5 тысячи жителей.

Было принято решение привлечь учащихся Маховской школы к систематизации сведений, касающихся сожженных деревень Могилёвщины, в частности в Маховском сельсовете, и отметить их на карте.

В деревне Мосток было убито 227 жителей и сожжено 258 домов. Больше всего впечатлила история деревни Горяны, где 15 сентября 1943 г. каратели стёрли с лица земли деревню вместе с жителями. 18 февраля 1943 г. немецкие захватчики сожгли жителей деревни Дубинка Вендорожского сельсовета. Всего в этот день было сожжено 186 человек.



21 марта 2023 г. работа по созданию карты была завершена. На протяжении дня возле карты проводились беседы "Огненные сёстры Хатыни", обзоры книжных выставок «Геноцид в Беларуси», «Хатынь — наша память и боль».




Время всё дальше отодвигает события Великой Отечественной войны. Как научить детей помнить защитников Родины, отстоявших родную землю, гордится мужеством, героизмом, стойкостью солдат и офицеров, самоотверженностью тружеников тыла — женщин, стариков и детей? Где взять эти знания, чтобы передать детям? Первоисточником является сам человек. Свидетелей осталось очень мало. Очень важно именно сейчас не прервать нить памяти о прошлом нашей страны.

В Маховском сельсовете пять сожжённых деревень: Большая Дубровка, Костинка, Липец, Пустой Осовец, Растополье. Чудом уцелели жители д. Пустой Осовец. Немецкие солдаты и полицаи, обвинив жителей в помощи партизанам, 19 августа 1943 года, ранним утром окружили деревню, жителей выгнали из домов, согнали в центр, закрыли в амбаре и обставили пулемётами. Но, к счастью, немец-староста убедил карателей в неправильности доноса. Деревню сожгли, жителей взяли в плен. Воспоминания об этих страшных днях навсегда остались в памяти тех, кто чудом уцелел, и на чьих глазах разворачивалась эта страшная трагедия. Этим трагическим событиям была посвящена встреча «Диалог поколений», состоявшаяся 18 марта 2023 г., в которой приняли участие выжившая жительница сожженной деревни Пустой Осовец Надежда Миновна Протасова и учащиеся Маховской средней школы.



Надежда Миновна была в том амбаре и без слёз не могла об этом вспоминать... В завершении встречи ребята помогли Надежде Миновне по хозяйству, а она, поблагодарив, пожелала детям любить свою Родину, чтить память своих предков, помнить о подвиге наших солдат.

*Екатерина ДУБРОВСКАЯ.*

**17** марта 2023 г. в Восходовской сельской библиотеке в рамках марафона к 80-летию Хатынской трагедии была проведена виртуальная экскурсия «Огненные Борки». Библиотекарь рассказала ребятам о трагедии деревни Борки Кировского района Могилёвской области, которая произошла 15 июня 1942 года во время карательной операции бригады штурмбанфюрера СС Оскара Пауля Дирлевангера против мирного населения. В огне, заживо сожжённом фашистами, погибли Борки и прилегающие деревни и посёлки — Длинное Поле, Красный Пахарь, Хватовка, Дзержинский, Пролетарский, Закриничье. Вместе с деревнями заживо сгорели 1800 жителей.

Участники встречи виртуально посетили мемориальный комплекс в Борках «Памяти сожжённых деревень Могилёвской области».

*Анна ДАНИЛОВИЧ.*








Мікола Яцкоў
**РОЗДУМ У БОРКАХ**

*Алесю Казеке*

І неба блакітам накрыла пагоркі,
і чырванню чэрвень ахутаў палі,
і чорнае сонца маўчала над Боркамі,
аблокамі белымі душы плылі.

І раптам сціскаецца сэрца адчайна,
і толькі струной абарванай жаўрук
ляціць праз жыццё
незабыўным гучаннем, —
ніколі не знікне жалобны той гук...

*18 чэрвеня 2014 г.*

**21** марта 2023 г. в Заводскослободской сельской библиотеке прошёл час истории «Колокола Хатыни». Школьники познакомились с трагическими событиями, которые произошли на белорусской земле 22 марта 1943 года. В тот день белорусская деревня Хатынь, насчитывавшая 26 дворов, была полностью уничтожена немецко-фашистским карательным отрядом. Все 149 жителей деревни, из которых 75 – дети,



были расстреляны и заживо сожжены в качестве мести за оказание помощи партизанам. Трагедия Хатыни стала в истории одним из самых скорбных эпизодов массового уничтожения мирного населения на оккупированной территории.

Участники встречи проявили большой интерес к литературе о хатынской трагедии — к «Хатынской повести» Алеся Адамовича, фотоальбому «Хатынь» и другим книгам.

*Людмила ЗАЙЦЕВА.*



**20** марта 2023 г. в Семукачской сельской библиотеке для учащихся 2 – 4-х классов ГУО «Семукачская средняя школа» был проведён историко-краеведческий час «О ком звонят колокола?». Библиотекарь рассказали детям об истории возникновения деревни Хатынь и о той ужасной трагедии, которая постигла её жителей в годы Великой Отечественной войны.

Информацию об истории создания мемориального комплекса «Хатынь», впечатляющего архитектурно-художественного сооружения, присутствующие услышали, совершив виртуальную экскурсию «Хатынь: символ вечной памяти и скорби белорусского народа». Затем школьники совершили экскурсию в историко-краеведческий музей Семукачской средней школы. Вниманию детей была представлена новая музейная экспозиция «Геноцид белорусского народа в годы Великой Отечественной войны».

К мероприятию в библиотеке была оформлена книжная выставка «Хатынь: говорящая тишина».

*Алла СТРИКУНОВА.*











**В** Сидоровичской сельской библиотеке 21 марта 2023 г. для старшеклассников прошёл информационный час «Хатынская трагедия». Ребята вспомнили о той трагедии, которая постигла жителей деревни Хатынь в марте 1943 когда, когда фашисты заживо сожгли всех её жителей. А также узнали, что наряду с деревней Хатынь были сожжены и уничтожены вместе с мирными жителями 246 деревень Беларуси.

К мероприятию была организована книжная выставка «Хатынь: говорящая тишина».

*Татьяна СОЛОНОВИЧ.*






**22** марта 2023 года в рамках марафона к 80-летию Хатынской трагедии филиал «Сельская библиотека агрогородка Кадино» совместно с филиалом "Кадинский СДК" провели митинг "Хатынь — символ вечной памяти и скорби белорусского народа".

*Офеля АВЕТЯН.*




**П**росмотр документального фильма 1968 года «Хатынь, 5 км», снятого по сценарию известного белорусского писателя Алеся Адамовича, состоялся 22 марта 2023 г. в Восходовской сельской библиотеке. Фильм посвящён единственному оставшемуся в живых взрослому жителю деревни Хатынь Иосифу Каминскому, ставшему позже прообразом главной скульптуры монумента «Хатынь». В заключение учащиеся минутой молчания почтили память всех погибших в годы Великой Отечественной войны, познакомились с тематической выставкой «Хатынь: говорящая тишина».

*Анна ДАНИЛОВИЧ.*



*Иосиф Каминский у первоначального монумента на месте сожжённой Хатыни*



*Иосиф Каминский рассказывает...*



# Аўтограф паэта




Дзінь-дзінь,
дзінь – дзінь – дзінь...
Што гэта звініць Хатынь?

Тут звінелі сініцы і палазы
і звінелі жаўранкі ў паднябессі.
Тут звінелі дзіцячыя галасы
і звінелі дзявочыя песні.

Тут звінела пчала,
і звінела піла,
і звінела каса,
і звінела даёнка,
і звінелі, на радасць ўсяго сяла,
тут вясельныя бомы звонка.

Дзінь-дзінь,
дзінь – дзінь – дзінь...
Што гэта звініць, Хатынь?
Што значаць яны, твае званы?
Ці гэта гучаць адгалоскі
той вёскі, што была да вайны,
той колішняй мірнай вёскі?

Дзінь-дзінь...
Паслухайце, ці не едзе
гэта вяселле недзе?
Ды хто ж нявеста і жаніх,
калі нікога няма ў жывых?

Дзінь-дзінь...
А гэта не коні ў жытным?
Ды коні патрэбны толькі жывым,
а мёртвым ніколі
не патрэбны коні.

Дзінь-дзінь...
А гэта не сырадой
цурчыць у даёнку з пенай густой?
Не, мёртвым сном у Хатыні
спяць усе гаспадыні.

Дзінь-дзінь...
А гэта не юны смех,
не голас дзіцячых забаў і ўцех?
Не, спалены ўсе дзеткі,
спалены ўсе малалеткі.

Дзінь-дзінь,
дзінь – дзінь – дзінь...
Што гэта звініць, Хатынь?
Што значыць тваіх камінаў
перазвон?
Гэта звініць твой вечны сон?
Ці, можа, у гэтым звоне –
вечнае бяссонне?

Дзінь-дзінь,
дзінь – дзінь – дзінь...




Была на Зямлі
(у Лагойскім раёне, на Беларусі)
вёска хат сасновых — Хатынь.
Там гуляла ў вокнах сінь,
на сонцы грэліся гладышы і слоікі,
сушыў іх на сонцы тын.

Там поле вясной аралі,
жытам і лёнам зямлю засявалі,
Там песні свае
(такіх нідзе не пачуеш!)
на Купалле і на дажынках спявалі.

Там маці, выцягваючы з вузялка,
скупыя рублі,
дачушцы панчошкі купляла,
А як гуляць, маладу,пускала,
выходзіла за вароты,
хусткі ражок кусала...

Аднойчы прыйшлі сюды людзі
ў зялёных фрэнчах,
з кулямётамі
і агнём.
Вочы былі ў іх з халоднага лёду,
сэрцы — з каменю.
Кажуць, тады далёка з дымам
ляцеў людскі развітальны крык...

Хто галаву не схіліць,
пачуўшы пра гэта:
На цэлую вёску людзей
асірацела планета!
Сталі попелам сівым
і вочы, і рукі, і ўсмешкі;
Навек загінула
(і ніколі ўжо не ўваскрэсне!)
там песня...




**22** марта 2023 г. в сельской библиотеке-клубе деревни Брыли состоялся час памяти "Хатынь... Мы помним!", приуроченный к 80-летию трагедии деревни Хатынь. Заведующая библиотекой рассказала о трагедии этой белорусской деревни, которая явилась отражением трагедии всего белорусского народа в годы военного лихолетья. Также прозвучал рассказ о деревнях Могилевского района, которые разделили участь Хатыни и были сожжены вместе с жителями. Участники ознакомились с подготовленной тематической книжной выставкой, где особое внимание привлекла книга "Я з вогненнай вёскі" с автографами авторов — Янки Брыля и Владимира Колесника, и посмотрели видеозапись выступления Фёдора Николаевича Матькова, который во время оккупации был свидетелем уничтожения его родной деревни Мосток Могилёвского района, когда было сожжено 258 домов и убито 227 человек.




*Юлия ЯЦКОВА.*









Слёзы душаць,
не выйсці з былога,
не магу,
не пытайце ў мяне.
Запытайце ў Камінскага — у другога,
у таго,
што ад роспачы скамянеў.
Слёзы высушыў яму вецер.
Ён раскажа...



22 марта 2023 г. в сельской библиотеке агрогородка Княжицы прошел марафон "Реквием сожженным деревням" к 80-летию Хатынской трагедии. Ребята узнали об истории возникновения Хатыни и о ужасной трагедии этой деревни в годы Великой Отечественной войны. Хатынь стала символом трагедии белорусского народа.

*Алина КОЛУПАЕВА.*



22 марта 2023 г. библиотекарь Сидоровичской сельской библиотеки совместно с организациями Сидоровичского сельисполкома приняла участие в митинге-реквиеме «Не смолкнет в памяти нашей ваших сердец колокольный звон», посвящённом 80-летию Хатынской трагедии. Присутствовавшие читали стихи, говорили о том страшном мартовском дне, возложили цветы и минутой молчания почтили память всех погибших в годы Великой Отечественной войны.

*Татьяна СОЛОНОВИЧ.*





Для младших школьников в Романовичской сельской библиотеке 22 марта 2023 г. прошёл час кино «Голос Хатыни звучит». В ходе просмотра документального фильма дети узнали об одном из самых трагичных эпизодов в годы Великой Отечественной войны на территории Беларуси — сожжении деревни Хатынь. Присутствующие приняли участие в беседе о мужестве и героизме наших людей в годы Великой Отечественной войны, а также вспомнили белорусские деревни, которые разделили судьбу Хатыни.



*Елизавета БОТЭ.*

Библиотекарь Мостокской сельской библиотеки совместно с педагогами Мостокской средней школы 22 марта 2023 г. провели час памяти «Трагедия и память Хатыни». Учащиеся познакомились с трагическими событиями 22 марта 1943 г. Рассказ библиотекаря о Хатынской трагедии сопровождался показом документального фильма «І будзе жыць Хатынь». К мероприятию была оформлена книжная выставка «Хатынь: говорящая тишина», на которой была представлена литература о судьбе «огненных деревень». У памятника воинам, погибшим в боях с немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны, состоялся митинг - реквием. Школьники возложили цветы и почтили память павших минутой молчания.

*Елена ЯКУШЕВА.*












## ГАРАНСКАЯ ТРАГЕДЫЯ

*15 верасня 1943 года
вёска Гараны Магілёўскага раёна
была датла спалена
нямецкімі карнікамі,
а яе жыхары —
звыш 300 чалавек —
былі бязлітасна знішчаны.
Трагедыі тых жудасных дзён
прысвячаецца.*

Нас не забыць пра тыя дні,
Пра тыя цяжкія гадзіны,
Калі палала ў агні
Мая пакутная Радзіма.

Вось так і тут тады было:
Стары, малы ў час навалы
Ляглі ў зямлю ўсім сялом,
А з імі — думы іх і мары.

Ім так хацелася ўсім
Дажыць да светлай Перамогі,
Пабачыць, як асядзе дым
На ўсіх шляхах, на ўсіх дарогах,
Як вернуцца дамоў з вайны
І радасць прынясуць у хаты
Бацькі малых, старых сыны —
Героі воіны-салдаты.

Малым хацелася яды —
Тады і хлеба не хапала.
Ды прычакаліся бяды —
Яе ім кожнаму папала.

Сагрэць хацелася старым
На цёплай печы свае косці.
І тут з'явіліся звяры —
Нікім не прошаныя "госці".

Узялі карнікі ў кальцо
Усё сяло, яго абшары
І накармілі ўсіх свінцом,
Сагрэлі ў полымі пажару.

Сагналі больш трохсот у хлеў —
Малых, старых, раздзетых, босых —
І падпалілі. Пачарнеў
Ад жудасці блакіт нябёсаў.

Кідаліся ад кута ў кут,
Агонь і дым ім лез у грудзі,
Такіх мучэнняў і пакут
Не ведалі ад роду людзі.

Вакол стаялі, як ваўкі,
У чорным каты і аўчаркі.
Сабакі шчэрылі клыкі,
Смакталі карнікі цыгаркі,
Пакуль не абваліўся дах,
Пакуль не змоўклі енкі, крыкі...

Застанься і звіні ў вяках
Наш крык,
наш плач.
Наш боль вялікі.

Згарэлі людзі і сяло,
За што — згарэўшыя не знАлі.
І толькі потым усплыло —
Забілі немца партызаны
Паблізу недзе ля Гаран.

Не мелі літасці фашысты:
Знішчалі ўсё, як ураган,
Пакуль не ўзняўся сцяг агністы
Над іх рэйхстагаўскім гняздом
Вясенім днём у сорак пятым.
І, сплюнуўшы, баец са злом
Пакрыў вайну апошнім матам.

З франтоў вярнуліся байцы
Дамоў і ў родныя Гараны.
Мацней занылі іх рубцы,
Закрываточылі іх раны,
Калі сустрэў іх голы пляц
Ды абгарэлыя бярозы...

Усіх хай катаў спапяляць
На ўсіх шыротах нашы слёзы!

Каб месца не знайшлі яны
Сабе нідзе, апроч у петлях.
Каб нараджэнне сатаны
Не азмрачала дзень наш светлы.

Ніколі каб бяда і здзек
Не параджаліся на свеце,
Каб быў шчаслівы чалавек
На ўсёй зямлі, на ўсёй планеце.

Каб мір усюды беглі
Найбольш усякае святыні,
Каб паўтарыцца не змаглі
Гаран трагедыі й Хатыні.

Скланіцеся, таварышы,
У зямным паклоне нізка-нізка
Прад тымі, хто ў зямлі ляжыць
Пад шэрым, цяжкім абеліскам,
Прад тымі, хто аддаў жыццё,
Хоць і любіў яго бясконца,
За тое, каб усё цвіло,
Каб дым вайны не засціў сонца.

**Васіль КАРПЕЧАНКА**





| МОГИЛЕВСКИЙ РАЙОН Название | Разрушено домов | Убито людей |
|---|---|---|
| Большие Белевичи | 128 | 16 |
| Буйничи | 118 | 95 |
| Городище | 69 | 138 |
| Городок | 9 | 4 |
| Горяны | 67 | 300 |
| Добросневичи | 60 | 28 |
| Дубинка | 72 | 186 |
| Езерщина, пос. | 35 | 10 |
| Журовец 1-й | 43 | 29 |
| Закутье | 10 | 2 |
| Залубнище | 28 | 61 |
| Захват, пос. | 31 | 0 |
| Курган | 37 | 0 |
| Лубнище | 62 | 0 |
| Малое Бушково | 102 | 40 |
| Малые Белевичи | 69 | 0 |
| Михайловск | 35 | 2 |
| Мосток | 258 | 227 |
| Незовка | 59 | 0 |
| Николаевка | 11 | 0 |
| Песчанка | 70 | 52 |

*В Вендорожском сельсовете, в 18 км к северу от Могилева, расположена деревня Дубинка. В начале 1943 года она находилась под защитой 121-го партизанского полка Османа Касаева. Бойцы в любое время могли найти здесь убежище. Для них сельчане оставляли продукты, собирали оружие, медикаменты, прятали и лечили раненых.*
*18 февраля 1943 года фашисты окружили Дубинку, выгнали всех жителей на улицу и, вызывая каждую семью, разделили всех на две группы. Часть загнали в гумны, а остальных закрыли в доме напротив и выставили караул, чтобы никто не смог выйти. Страшно горели гумны, люди пытались выбраться из пламени, а немцы открывали по ним огонь. Запертые в домах напротив думали, что придет их очередь и их тоже сожгут. Но на следующий день всех выпустили и они пошли на пепелище — собрали то, что осталось от своих родных и близких, и похоронили рядышком...*

## БАЛАДА ВЁСКІ ДУБІНКА

Прыдняпроўскія нашы прасторы,
Магілёўская наша зямля!..
Тут гісторыі ткуцца ўзоры
І пяе веснавая ралля.

Тут працоўныя рукі ў пашане,
Новы дзень дорыць нам адкрыццё,-
Светлай радасцю гэта абранне,
Дзякуй лёсу за гэта жыццё!

І тады, ў сорак першым, далёкім
Усім хацелася жыць, працаваць,
І плылі ў небе сінім аблокі,
І не думаў ніхто паміраць.

Але грымнула чорная сіла
І па нашай зямлі папаўзла —
Разбурала, паліла, крышыла
У аблічы ўсяленскага зла.

Калі зло пачынае сваволіць,
То дабро пачынае сталець, —
Пачалі за краіну і волю
Партызанскія пушчы гудзець.

Білі ворагаў тых што ёсць моцы,
І дужэў партызанскі заслон.
І Асмана Касаева хлопцы
Берaглі Магілёўскі раён.

Тут былі партызанскія вёскі,
І Дубінка давала спачын,
І свае дадавала ўнёскі,
Дапаможны трымала свой чын.

І лясных абаронцаў карміла,
Саграваала ў марозы цяплом, —
І была тут народная сіла,
Быў савецкі і вольны тут дом.

Але лютая зграя не сціхла,
Зноў ваколле пад чорным крылом,--
І ў той лютаўскі дзень злое ліха
Над Дубінкай зрабіла залом:
З хат пагналі ўсіх без разбору
У калгасныя гумны, туды, —
Запалілі, стралялі... Ох, гора!
Не схавацца ад гэтай бяды!..

Палыхнула ўсё вогненна-ярка —
Слоў няма, каб аб тым расказаць.
"Мама, мамачка! Жарка мне, жарка!
Мама, мамачка! Ножкі гараць!
Мама, ма..."
І анёламі ў неба
Паляцелі сто восемсят душ...

А ўнізе дымілася глеба
Пад завеямі лютаўскіх сцюж.

І бясконцае рэха гучала
Тых апошніх людскіх галасоў.
Цішыня там маўклівая крычала,
Бо не стала на свеце ўсіх слоў...

... Час прайшоў. І Дубінка паўстала -
Зазвінелі дзяцей галасы,
І вясна зноў раллю распахала,
І ў палях шамацяць каласы.



І над гэтым жыццём, на кургане
Напамін белай стэлай стаіць —
Аб пякучай, балючай той ране,
Што баліць, і баліць, і баліць.

Гэты боль не заціхне ніколі,
І глядзяць тыя вочы адтуль,
Нібы кажуць: "Жывіце прывольна
Без вайны, без агню і без куль.
Хай квітнеецца ваша дарога,
Хай вам лёс прынясе благадаць,
І жыццё — падарунак ад Бога —
Хай ніхто ў вас не зможа забраць!"

**Мікола ЯЦКОЎ**














**23** марта 2023 г. в сельской библиотеке агрогородка Речки состоялся актуальный разговор «Кнігі, якія прымушаюць маўчаць» для детей, подростков и взрослых. Участникам актуального разговора были представлены книги: «Хатынь» Зельского А.Г.; «Нельзя забыть. Нельзя понять. Нельзя оправдать», 2018; «Геноцид белорусского народа: информационно-аналитические материалы и документы / Генеральная прокуратура Республики Беларусь, 2022., «Я з вогненнай вёскі» А.Адамовича, Я.Брыля, В. Колесника; «Хатынская аповесць» А.Адамовича, которые не оставили присутствующих равнодушными. Прозвучали произведения, которые не раз читались вслух в библиотеке — стихотворение В.Карпеченко «Гаранская трагедыя» о фашистской карательной операции в деревне Горяны Могилёвского района и поэма «Марыйка» А.Казеко о трагедии деревни Борки Кировского района. В конце разговора участники ознакомились со статьями в газете «СБ: Беларусь сегодня», в которых описаны воспоминания свидетелей Хатынской трагедии, приведены новые документальные факты геноцида белорусского народа. В заключительном слове библиотекарь ещё раз сосредоточила внимание собравшихся на величайшей трагедии XX столетия, в которой погиб каждый четвертый житель белорусской земли. И поэтому так важно сохранить об этом память.

*Тамара ЦИРКУНОВА.*






















*“БІБЛІЯТЭЧНЫ ГАСЦІНЕЦ”*
Інфармацыйны бюлетэнь
дзяржаўнай установы культуры
“Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк”.
Распаўсюджваецца на правах
унутранай дакументацыі.

Адказны за выпуск —
Юлія Мікалаеўна Яцкова
Адрас: 213134 Магілёўскі раён,
аг.Буйнічы, вул.Легендарная, д.10 кв.57-58
тэл. 8 (0222) 71-20-77, 70-85-21
e-mail: rcbs.buin@yandex.by, brulib@yandex.by

Матэрыялы друкуюцца на мове аўтараў.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць
за падбор і дакладнасць фактаў.
Звярстана і надрукавана на ўласным абсталяванні.
Падрыхтавана да друку *30.03.2023 г. 21.00.*
Наклад 30 асобнікаў. Распаўсюджваецца бясплатна.

ВКонтакте
https://vk.com/public156515205